участницами ЕС и НАТО. В этой связи необходимо понимание внешнего контекста как залога успешного развития Калининграда, который на сегодняшний день в первую очередь состоит в многоплановом и взаимовыгодном сотрудничестве Российской Федерации и ЕС.

**Литература**

1. Regions in Central and Eastern Europe: past and present / ed. by Hayashi Tadayuki, Fukuda Hiroshi. — Sapporo : Slavic Research Center, Hokkaido University, 2007.

2. Волошенко К. Ю. Проблемы регионального развития Калининградской области в условиях вступления России в ВТО / К. Ю. Волошенко. — Вестник Калининградского государственного университета, 2004. — № 6.

3. Зверев Ю. М., Федоров Г. М. Поле взаимодействия России и Европейского Союза [электронный ресурс]. — Режим доступа: <http://www.vestnik.vsu.ru/pdf/geograph/2009/02/2009-02-17.pdf>. — Дата доступа: 29.10.2012.

4. Стратегия социально-экономического развития Калининградской области на средне- и долгосрочную перспективу [Электронный ресурс]. — Режим доступа: <www.i-kaliningrad.ru/wp-content/uploads/2012/.../strategy-project.pdf>. — Дата доступа: 08.10.2012.

## Архітэктурна-планіровачная структура Полацка ў XVI–XVII стагодзях

*Селядцова К. А., студ. V к. БДПУ,*
*навук. кір. Рацько А. Ф., канд. гіст. навук, дац.*

Горадабудаўніцтва і архітэктура заўсёды з’яўляліся важнейшымі складаючымі гістарычнага працэсу фарміравання асяроддзя жыхарства людзей. Гэтыя кампаненты матэрыяльнай культуры на розных гістарычных этапах залежалі ад пэўных фактараў: гаспадарчага ўкладу, інфраструктуры камунікацый, характару і шчыльнасці рассялення. Пазначаныя фактары ўплывалі на памеры і структуру, планіроўку і забудову гарадоў. Што датычыцца Полацка, то неабходна звярнуць увагу на тое, што ў другой палове XVII і першай палове XVIII ст. горад перажываў цяжкі перыяд свайго гістарычнага развіцця, выкліканы зацяжнымі войнамі — Расіі з Рэччу Паспалітай, Паўночнай вайною. Таму значных радыкальных змен гарадской тапаграфіі не адзначаецца.

Разглядаючы планіровачна-кампазіцыйнае вырашэнне горада Полацка ў XVII ст., неабходна адзначыць, што яшчэ ў сярэдзіне XVI ст. Полацк па-ранейшаму складаўся з Верхняга замка (адміністрацыйны і культурны цэнтр), Ніжняга (Стралецкага) замка, Вялікага і Запалоцкага пасадаў [1, с. 28–29]. Наконт левабярэжных пасадаў існуюць розныя меркаванні.

На думку С. В. Тарасава, Полацк у XVI–XVII стст. меў 6 пасадаў [2, с. 24]. Паводле В. А. Вароніна, у XVI–XVII стст. горад складаўся з Вялікага, Запалоцкага, Востраўскага (ці Крыўцова), Экіманьскага, Слабадскога пасадаў. Д. У. Дук прыводзіць звесткі, якія дазваляюць сцвярджаць, што ў першай трэці XVII ст. на левым беразе Дзвіны існаваў адзін пасад, які меў назву Крыўцоў [1, с. 33–36].

У самой жа архітэктуры горада ўмоўна можна вылучыць два асноўныя тыпы будынкаў: будынкі грамадскага прызначэння і культавыя збудаванні. Да грамадскіх адносяцца замкава-крэпасная і палацава-сядзібная архітэктура, навучальныя ўстановы, ратушы, гандлёвыя рады, жылая забудова і інш. Да культавых збудаванняў — храмы, цэрквы, касцёлы, кляштары, ансамблі манастыроў і інш.

Сярод грамадскіх будынкаў Полацка называюцца ратуша з гандлёвымі радамі, чатыры гасцінныя дамы, млын на Палаце, гарадская лазня, дзве карчмы. Да культавых будынкаў адносяцца праваслаўныя Сафійскі і Пятроўскі манастыры ў Верхнім замку і Васкрасенскі ў Ніжнім, Срэценская, дзве Мікалаеўскія царквы таксама на тэрыторыі замкаў; Богаяўленскі манастыр на беразе Дзвіны. У другой палове XVII ст. тут узведзены будынак школы. Сярод каталіцкіх кляштараў у гістарычных крыніцах упамінаюцца бернардзінскі, закладзены ў 1498 г., і драўляны францысканскі — 1684 г. У першай палове XVI ст. пабудаваны адзін са старажытнейшых у Вялікім Княстве Літоўскім кальвінскі сбор. Акрамя таго, у 1581 г. на востраве, што на Заходняй Дзвіне, закладзены езуіцкі калегіум. У XVII ст. паблізу Верхняга замка з’явіўся новы калегіум, а стары пасля быў разбураны.

Такім чынам, яшчэ ў XVI ст. была закладзена схема размяшчэння культавых будынкаў уздоўж прыродных прастораў Дзвіны і Палаты. Яна дапоўнілася групай храмаў на Вялікім пасадзе і царквою св. Духа ў Запалоцці. Пры гэтым значэнне галоўнай дамінанты захаваў Сафійскі сабор.

У XVII ст. горад развіваецца ва ўсходнім напрамку ўздоўж Дзвіны (раён Пераддзвіння), уключаючы тэрыторыю Вялікага пасада. У 1655 г. Верхні замак быў умацаваны тынам з 9 вежамі, у Ніжнім замку было 7 вежаў. У крэпасных сценах замкаў размяшчалася пяць варот. Сярод будынкаў Верхняга замка ўпамінаюцца келлі і парадныя памяшканні архіепіскапскага двара, брама насупраць Сафійскага сабора. У 1654–1663 гг. вакол Пераддзвінскага пасада ўзведзены новыя ўзмоцненыя абарончыя збудаванні.

У канцы XVII ст. асноўная частка гарадской забудовы канцэнтравалася паміж Дзвіной і Палатой, дзе і цяпер згрупаваны гістарычна каштоўныя будынкі. Для простакутнай сеткі вуліц, закладзеных на плоскім рэльефе, арганізуючае значэнне мела Дзвіна. Паралельна ёй праходзілі асноўныя вуліцы, перпендыкулярныя напрамкі звязвалі раёны горада з ракой. У забудове простакутнай гандлёвай плошчы дамінаваў мураваны езуіцкі кас-

цёл святога Стэфана, да якога прымыкалі карпусы калегіума. Калегіум з’яўляўся галоўным элементам ансамбля грамадскага цэнтра, знаходзячыся на завяршэнні асноўнай планіровачнай восі горада прыкладна ў роўнай даступнасці ад усіх перыферыйных раёнаў. Таксама тут размяшчаўся і дамініканскі кляштар.

Такім чынам, забудова і планіроўка Полацка на працягу стагоддзяў зведала значныя змены. Гэта быў натуральны і заканамерны працэс у структуры горада, які пастаянна рос і развіваўся. Разам з тым, нягледзячы на тапаграфічныя змены гарадскіх цэнтраў, гарадской улады і гандлю, захаваліся традыцыі ў забудове і планіраванні горада. У XVII ст. Полацк меў у асноўных рысах веерна-радыяльную планіроўку.

### Літаратура


1. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стст.: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. — Наваполацк: ПДУ, 2007. — 268 с.
2. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст.: гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. — Мінск: Бел. навука, 1998. — 183 с.